***Ж. Л. Раманава,***
*старшы выкладчык*

# ПУБЛІЧНЫЯ БІБЛІЯТЭКІ Ў СІСТЭМЕ БЕСПЕРАПЫННАЙ АДУКАЦЫІ

Пытанне бесперапыннай адукацыі з'яўляецца адным з важнейшых для сучаснага грамадства. У шэрагу прычын, абумовіўшых яго вастрыню, важнае месца займае фарміраванне ў сусветным маштабе грамадства ведаў, фундаментальнай асновай якога становіцца «эканоміка ведаў», што ўключае, на думку спецыялістаў, тры асноўныя сферы: «НДВКР і інавацыі, адукацыю і навучанне, якія садзейнічаюць фарміраванню чалавечага капіталу, і камп'ютарныя тэхналогіі» [2]. Асобая ўвага надаецца інстытутам адукацыйнай сферы, паколькі ў цэнтры адукацыі, як і ў цэнтры эканомікі ведаў, знаходзіцца чалавек, фарміраванне і развіццё асобы. Адукацыя сёння разумеецца не толькі як базавая аснова для атрымання агульнай і прафесійнай падрыхтоўкі, але ў большай ступені як сфера фарміравання творчай, дзейнаснай асобы, якая накіравана на самаўдасканаленне, усведамляе неабходнасць пастаяннага абнаўлення атрыманых ведаў, інтэлектуальна і псіхалагічна падрыхтавана да авалодання новымі тэхналогіямі і прымянення іх у прафесійнай і паўсядзённай рэчаіснасці, якая можа самастойна шукаць і выкарыстоўваць інфармацыю, набываць неабходныя кампетэнцыі ў сацыяльнай і прафесійнай сферы, а значыць, быць запатрабаванай у эканоміцы ведаў. Такім чынам, асноўная задача адукацыйнага сацыяльнага інстытута сёння – навучыць чалавека вучыцца, выхаваць усведамленне, што вучэбная дзейнасць – неабходны складнік яго жыцця і сродак дасягнення кар'ернага поспеху, творчай самарэалізацыі, паўнацэннага і ўпэўненага існавання ў грамадстве ведаў.

У гэтым аспекце актуальнасць набывае працэс бесперапыннай адукацыі, дзе акцэнт робіцца на развіцці і стымуляванні матывацыйнай сферы асобы, выхаванні адпаведнага светапогляду, а таксама на стварэнні неабходных умоў забеспячэння як адукацыйнай, так і самаадукацыйнай дзейнасці чалавека. «Неад'емнай умовай забеспячэння бесперапыннай адукацыі, самастойнага прыняцця рашэнняў і культурнага развіцця грамадзян і сацыяльных груп» з'яўдяецца дзейнасць публічных бібліятэк [3]. У «Руководстве ИФЛА/ЮНЕСКО по развитию службы публичных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

библиотек» адзначаецца, што публічная бібліятэка павінна забяспечваць доступ да ведаў для падтрымкі фармальнай і нефармальнай адукацыі і ў гэтых мэтах прадастаўляць карыстальнікам неабходныя матэрыялы, тэхнічныя сродкі і дапамагаць ім эфектыўна выкарыстоўваць вучэбныя рэсурсы [5].

Абапіраючыся на дакументы міжнародных арганізацый, бібліятэчных асацыяцый розных краін, можна сфармуляваць *задачы* публічных бібліятэк: 1) замацаванне навыкаў чытання, прыцягненне насельніцтва да чытання; 2) аказанне падтрымкі адукацыі і самаадукацыі на ўсіх ступенях; 3) стварэнне ўмоў для творчага развіцця асобы; 4) забеспячэнне доступу да культурных каштоўнасцей, стымуляванне цікавасці да іх, садзейнічанне міжкультурнай камунікацыі; 5) забеспячэнне доступу да ўсіх відаў інфармацыі і аказанне інфармацыйных паслуг розным катэгорыям карыстальнікаў; 6) садзейнічанне авалоданню інфармацыйнай культурай.

Гэтыя задачы, а таксама спецыфіка публічных бібліятэк, якая заключаецца ў тым, што іх фонды на 50–60% складаюцца з мастацкай літаратуры, абумоўліваюць развіццё наступных кірункаў іх дзейнасці:

1) забеспячэнне адукацыйных, самаадукацыйных інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў усімі відамі інфармацыйных рэсурсаў, у тым ліку ў рэжыме онлайн-доступу. Неабходна мэтанакіраванае фарміраванне фондаў публічных бібліятэк, што забяспечваюць працэс бесперапыннай адукацыі, стварэнне так званай адкрытай бібліятэкі, якая эфектыўна выкарыстоўвае інфармацыйныя рэсурсы іншых арганізацый, у тым ліку і адукацыйных. Акрамя таго, пры абслугоўванні дзяцей і моладзі асобую ўвагу неабходна сканцэнтраваць на стварэнні цікавай і стымулюючай атмасферы для вучобы, забяспечыць атрыманне навыкаў плённага навучання, сфарміраваць асэнсаваную накіраванасць на авалоданне новымі ведамі, выхаваць патрэбнасць і ўменне вучыцца самастойна. Для дарослых карыстальнікаў першаступеннае значэнне мае стварэнне псіхалагічна камфортнай адукацыйнай прасторы, паколькі для людзей старэйшага ўзросту змена прафесіі, перападрыхтоўка, неабходнасць засваення новых ведаў, самастойная вучэбная дзейнасць з’яўляюцца мадэратарамі стрэсу. Задача публічнай бібліятэкі не толькі забяспечыць такіх карыстальнікаў патрэбнымі крыніцамі, але і дапамагчы ў пераадоленні псіхалагічных бар’ераў, нівеліраваць наступствы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стрэсу. Рэалізаваць гэта можна праз стварэнне пры бібліятэках «цэнтраў «адкрытай» і нефармальнай адукацыі», якія прадастаўляюць «неабходныя матэрыялы, трэнінг і падтрымку» [4] карыстальнікам розных узроставых катэгорый, выкарыстоўваючы магчымасці дыстанцыйнага навучання, арганізуючы кансультацыі педагогаў і псіхолагаў пераважна ў онлайнавым рэжыме;

2) ажыццяўленне сацыяльна-адпачынкавай дзейнасці ў мэтах выхавання асобы, развіцця творчых здольнасцей карыстальнікаў. Для рэалізацыі мэт бесперапыннай адукацыі тут важна звярнуць увагу перш за ўсё на маральна-этычнае, прававое, эстэтычнае выхаванне, якое можа ажыццяўляцца як праз інфармацыйныя рэсурсы, і ў першую чаргу праз творы мастацкай літаратуры, так і рознымі формамі і метадамі культурна-адпачынкавай дзейнасці бібліятэкі. Акрамя гэтага, публічная бібліятэка можа стаць базай атрымання нефармальнай і інфармальнай адукацыі праз арганізацыю розных гурткоў, курсаў, клубаў і інш., дзейнасць якіх звязана з літаратурнай і мастацкай творчасцю, прычым з прыцягненнем для кіраўніцтва імі спецыялістаў пэўнай сферы, выкарыстання магчымасцей дыстанцыйнага навучання, што будзе служыць мэце развіцця творчых здольнасцей карыстальнікаў. Прычым важна, што бібліятэка можа і павінна выкарыстоўваць патэнцыял выкладчыкаў і навучэнцаў гэтых гурткоў і курсаў, прыцягваць іх да ўдзелу ў арганізацыі і правядзенні мерапрыемстваў, да папулярызацыі бібліятэкі і чытання;

3) ажыццяўленне дзейнасці па папулярызацыі культуры, нацыянальнай і культуры этнічных меншасцей, што пражываюць на тэрыторыі краіны, у мэтах выхавання патрыятызму, пачуцця годнасці за сваю краіну і малую радзіму, а таксама талерантнасці, уяўленнняў аб разнастайнасці культур і іх захаванні, неабходнасці міжкультурнага дыялога праз прадастаўленне інфармацыі ў традыцыйнай і электроннай форме, праз выкарыстанне інавацыйных метадаў папулярызацыі культурнага скарбу;

4) фарміраванне інфармацыйнай культуры карыстальнікаў. Задача бібліятэкі ў гэтым кірунку – фарміраванне ўменняў выкарыстоўваць сучасныя інфармацыйныя рэсурсы як канкрэтнай бібліятэкі, так і іншых інфармацыйных сістэм у вучэбнай, самаадукацыйнай, навуковай, адпачынкавай дзейнасці. Акрамя таго, неабходна засяроджваць увагу на этычна-прававых праблемах работы з інфармацыяй, на аспектах інфармацыйна-псіхалагічнай бяспекі, выхаванні чытацкай культуры. Дзейнічаючы ў дадзеным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кірунку, публічная біблітэка павінна быць месцам, дзе карыстальнік вучыцца шукаць, апрацоўваць, крытычна ацэньваць інфармацыю і пераўтвараць яе ў веды.

Такім чынам, можна вылучыць асноўныя *функцыі* публічнай бібліятэкі як кампанента сістэмы бесперапыннай адукацыі:

– адукацыйна-выхаваўчая – бібліятэка забяспечвае магчымасць атрымання фармальнай адукацыі на базе як уласных рэсурсаў, так і рэсурсаў аддаленага доступу, а таксама з'яўляецца месцам, дзе карыстальнік мае магчымасць атрымаць нефармальную і інфармальную адукацыю. Акрамя таго, бібліятэка забяспечвае выхаванне асобы па розных кірунках;

– сацыялізуючы – публічная бібліятэка з'яўляецца месцам, дзе адбываецца засваенне сацыяльнай рэальнасці, сацыяльных норм і ўзораў паводзін праз літаратуру і мастацтва, а таксама ў працэсе бібліятэчнай камунікацыі;

– культурны – бібліятэка ажыццяўляе «распаўсюджванне культурных узораў, што забяспечваюць працэс інкультурацыі чалавека, увядзенне яго ў сістэму асноўных каштоўнасна-сэнсавых і нарматыўна-рэгулятыўных установак культуры, у тым ліку інфармацыйнай» [1];

– эстэтычны – публічная бібліятэка садзейнічае выхаванню пачуцця прыгожага, развіццю мастацкага густу, фарміраванню матывацый на спасціжэнне прыгожага ў жыцці і мастацтве;

– асветніцкі – бібліятэка з'яўляецца важным звяном прававой, экалагічнай, мастацкай, краязнаўчай асветы [6];

– кампенсатарны – бібліятэка стварае ўмовы для пераадолення псіхалагічнай напружанасці, выкліканай узаемадзеяннем чалавека з інфармацыяй у ходзе вучэбнай, навуковай, працоўнай дзейнасці, а таксама міжасобаснай камунікацыяй.

Такім чынам, публічная бібліятэка з'яўляецца паўнапраўным кампанентам сістэмы бесперапыннай адукацыі, паколькі ажыццяўляе яе інфармацыйнае забеспячэнне, прадастаўляе доступ да адукацыі, культуры і ведаў, а таксама можа служыць базай для фарміравання ў карыстальнікаў кампетэнцый у прафесійнай і асобаснай сферы.


1. *Гиляревский, Р. С.* Научная библиотека в эпоху электронных коммуникаций / Р. С. Гиляревский // Науч. и техн. б-ки. – 1998. – № 7. – С. 3–12.

2. *Дагаев, А. А.* Экономика знаний в информационном обществе / А. А. Дагаев. – URL: http://emag.iis.ru/arc/infosoc/emag.nsf/BPA/771baf208fec2a9ac3257576003b9b61.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. *Манифест* о публичной библиотеке ИФЛА/ЮНЕСКО. – URL: http://www.library.ru/1/kb/books/village_lib/prilozhenie_04.php.

4. *Манифест* публичных библиотек (г. Оейрас). Проект «PULMAN», программа «Электронная Европа». – URL: www.pl.spb.ru/manifest.doc.

5. *Руководство* ИФЛА/ЮНЕСКО по развитию службы публичных библиотек. – URL: http://unesdoc.unesco.org/images/0012/001246/124 654r.pdf.

6. *Тикунова, И. П.* Концептуальная модель современной библиотеки: социально-философский анализ : автореф. дис. … канд. филос. наук: 09.00.11 / И. П. Тикунова ; Поморск. гос. ун-т им. М. В. Ломоносова. – Архангельск, 2007.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ